**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________ А.В. Данільчанка
27.07.2015
(дата зацвярджэння)

Рэгістрацыйны № УД-558 / вуч.

**ТРЭВЭЛ-МЕДЫЯТЭКСТ**
**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**1-23 01 08 Журналістыка (па напрамках)**
**для напрамкаў спецыяльнасці**
**1-23 01 08-01 Журналістыка (друкаваныя СМІ)**
**1-23 01 08-04 Журналістыка (менеджмент СМІ)**

**2015 г.**

Вучэбная праграма складзена на падставе АСВА 1-23 01-08-2013 і вучэбных планаў УВА № Е 23-190/вуч. 2013 г., Е 23-193/вуч. 2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

С.В. Умец, выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 10 ад 26.05.2015 г.);

Вучэбна-метадычнай камісіяй Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнана ўніверсітэта
(пратакол №11 ад 29.06.2015 г.)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

*Характарыстыка вучэбнай дысцыпліны.* Сёння турызм набыў надзвычайную папулярнасць, у сувязі з чым у СМІ стала шырока асвятляцца падарожная тэматыка. Ва ўжытак увайшло і трывала замацавалася паняцце “трэвэл-медыятэкст”, або “трэвэлаг” (далей – ТМТ). ТМТ – такі тып тэксту СМІ, які прадстаўляе іншую краіну ў сукупнасці характэрных прыкмет: геаграфічнае палажэнне, прыродны свет, народ, мова, норавы, звычаі і традыцыі, гісторыя і культура, грамадска-палітычная сітуацыя – і які з’яўляецца ў выніку здзейсненага аўтарам падарожжа. ТМТ прызначаны для папаўнення ведаў адрасата пра іншую краіну і яе культуру, фарміравання яе вобраза ці карэкціравання яго ў свядомасці адрасата; ТМТ таксама выступае як сродак другаснай інкультурацыі, гэта значыць дапамагае адрасату засвоіць традыцыі і нормы паводзінаў у той ці іншай культуры. Якасны ТМТ – тэкст, у якім няма грубых парушэнняў этычных і культурна-маўленчых норм і які разам з меркаваннямі аўтара ўтрымлівае дакладную інфармацыю – выступае як сродак гуманізацыі сучаснага маўленчага асяроддзя, зніжэння ўзроўню яе агрэсіўнасці, садзейнічае распаўсюджанню культурнага рэлятывізму, а значыць, і гарманізацыі міжнацыянальных адносінаў.

*Роля і месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста.* Трэвэл-медыятэкст непасрэдна або апасродкавана адлюстроўвае сітуацыю міжкультурнай камунікацыі, таму пры стварэнні і аналізе ТМТ неабходна ўлічваць спецыфіку яго ўспрымання інкультураваным і неінкультураваным адрасатам; выяўленасць прынцыпаў этнацэнтрызму ці культурнага рэлятывізму; выкарыстанне культурных кодаў і стэрэатыпаў. Усе гэтыя прагматычныя ўстаноўкі могуць быць мэтазгодна рэалізаваныя толькі ў тым выпадку, калі ў аўтара сфарміравана ўяўленне пра маўленчыя асаблівасці ТМТ. Дысцыпліна “Трэвэл-медыятэкст” з’яўляецца факультатыўнай і прызначана для садзейнічання гуманізацыі камунікатыўных стратэгій, якія будуць выкарыстоўваць будучыя журналісты, паколькі якасны ТМТ павінен трансліраваць сацыяльна значныя сэнсы як нацыянальнага, так і наднацыянальнага ўзроўняў.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі вучэбнага плана.* Вывучэнне дысцыпліны “Трэвэл-медыятэкст” грунтуецца на ведах, атрыманых па дысцыплінах “Сучасная беларуская мова”, “Мова і стыль сродкаў масавай камунікацыі” і суправаджаецца паглыбленымі міжпрадметнымі сувязямі з дысцыплінай “Рэдагаванне”.

*Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны.* Мэты вывучэння дысцыпліны – сфарміраваць уяўленне пра спецыфіку трэвэл-медыятэксту як тыпу тэксту СМІ і развіць навыкі напісання розных відаў ТМТ (інфармацыйна-пазнавальных, інфармацыйна-папулярызуючых, інфармацыйна-рэкламных). Гэта дасягацца вырашэннем наступных задач: авалоданне неабходным для стварэння ТМТ наборам камунікатыўных установак; засваенне прыёмаў мовапараджэння, якія рэалізуюць гэтыя ўстаноўкі; вывучэнне спосабаў праяўлення

лінгвакрэатыўнасці – творчай перабудовы маўленчага матэрыялу без парушэння этычных норм маўленчых паводзінаў.

*Патрабаванні да асваення вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам.*

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць***:

– тыпалогію трэвэл-медыятэкстаў;
– функцыянальныя адрозненні трэвэл-журналіста і трэвэл-блогера;
– тэндэнцыі і перспектывы сучасных трэвэл-праграм;
– этычныя і культурна-маўленчыя нормы трэвэл-медыятэкстаў;

***умець***:

– аналізаваць і аргументавана абгрунтоўваць свае меркаванні наконт друкаваных трэвэл-медыятэкстаў і трэвэл-праграм;
– параўноўваць дзейнасць замежных і айчынных трэвэл-журналістаў;
– пісаць уласныя трэвэл-медыятэксты з улікам скіраванасці і аўдыторыі СМІ;
– выконваць тэставыя заданні, якія садзейнічаюць замацаванню вучэбнага матэрыялу;

***валодаць***:

– жанравай палітрай трэвэл-медыятэкстаў;
– прыёмамі мовапараджэння;
– спосабамі рэалізацыі асноўных функцый трэвэл-медыятэкстаў;
– метадамі і прыёмамі аналізу неабходнай для прафесійнай дзейнасці літаратуры.

*Характарыстыка метадаў і тэхналогій навучання.* Пры вывучэнні дысцыпліны, акрамя традыцыйных, выкарыстоўваецца метад інтэрактыўны, арыентаваны на больш шырокае ўзаемадзеянне студэнтаў не толькі з выкладчыкам, але і адзін з адным, на дамінаванне актыўнасці навучэнцаў у адукацыйным працэсе. У практыцы выкладання выкарыстоўваюцца камп’ютарныя тэхналогіі, электронная бібліятэка, сайтавае суправаджэнне навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу.

*У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны* «Трэвэл-медыятэкст» адведзена 34 аўдыторныя гадзіны. Дысцыпліна вывучаецца на трэцім курсе (5 семестр). Форма кантролю ведаў – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### 1. Трэвэл-медыятэкст (ТМТ) у сістэме краіназнаўчых тэкстаў

Месца трэвэл-медыятэксту ў сістэме краіназнаўчых тэкстаў. ТМТ як наратыўны немастацкі трэвэл-тэкст. Праблема вызначэння паняцця “трэвэл-медыятэкст” (“трэвэлаг”). Падабенства і адрозненні ТМТ, навуковага падарожжа і мастацкага ТТ (fiction).

### 2. Тыпавыя сцэнарыі падарожжа

Тыпы падарожжаў: класічная вандроўка, турызм, навуковае падарожжа, медыя-падарожжа, бэкпэкінг, даўншыфцінг. Суб’екты і мэты розных тыпаў вандровак. Дыхатамія феномена “турызм”. Падарожжа сёння: тэндэнцыі і прагнозы.

### 3. Асэнсаванне паняццяў “трэвэл-журналістыка” і “трэвэл-блогінг”

Праблема вызначэння паняццяў “трэвэл-журналістыка” і “трэвэл-блогінг”. Функцыянальныя адрозенні трэвэл-журналіста ад трэвэл-блогера. Трохфазнае асвятленне падарожжа ў блоге. Разнавіднасці трэвэл-постаў. Парады для стварэння трэвэл-блога. Прыкметы “праплачаных” постаў.

### 4. Тэлевізійная трэвэл-журналістыка

Узнікненне і станаўленне тэлевізійнай трэвэл-журналістыкі. Сучасныя трэвэл-праграмы. Спецыялізаваныя трэвэл-каналы. Рэвалюцыя ў трэвэл-журналістыцы ў змястоўным і тэхналагічным вымярэннях. Інфатэйнмент як асобы прыём перадачы інфармацыі. Гібрыдызацыя жанраў.

### 5. Тыпалогія журналісцкіх трэвэл-медыятэкстаў: інфармацыйна-пазнавальныя, інфармацыйна-папулярызуючыя, інфармацыйна-рэкламныя ТМТ

Інтэнцыі трэвэл-медыятэксту: інфармаванне, перакананне, забаўлянне. Тыпы ТМТ: інфармацыйна-пазнавальны, інфармацыйна-папулярызуючы, інфармацыйна-рэкламны. Характэрныя рысы маўленчай структуры розных тыпаў ТМТ. Дыялагічнасць. Унутрытэкставы час і прастора. Прыёмы рэалізацыі тактыкі эксплiцытнай сервільнасці і тактыкі тэстыманіяльнасці.

### 6. Спосабы і прыёмы мовапараджэння. Рэалізацыя функцый асветы (інфармавання), перакanання (уздзеяння), выхавання і забаўляння

Апавядальнасць і наратыўнасць ТМТ. Жанравая палітра (падарожны нарыс, нататкі, рэпартаж, агляд, рэкамендацыя). Сродкі ліквідавання “лакун” у трэвэл-тэксце. Лінгвакрэатыўнасць. Выкарытсанне экзатызмаў, этнонімаў, варварызмаў. “Разбурэнне стэрыатыпа”. Штампы і клішэ. Спосабы рэалізацыі функцый асветы (інфармавання), перакanання (уздзеяння), выхавання, забаўляння. Прыёмы стварэння эфекта займальнасці ў ТМТ.

### 7. Міжкультурная камунікацыя. Этычныя і культурна-маўленчыя нормы ТМТ

Асэнсаванне паняцця “міжкультурная камунікацыя”. Трэвэл-медыятэкст як вынік і як сродак міжкультурнай камунікацыі. Асноўныя этычныя праблемы трэвэл-журналістыкі. Этычныя запаветы. Маўленчыя праявы этнацэнтрызму. Гуманізуючыя маўленчыя стратэгіі ТМТ.

**Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Колькасць гадзін кіруемай самастойнай работы | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семіарскія) заняткі | Лабараторныя заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | | 6 | 9 |
| 1 | ТМТ у сістэме краіназнаўчых тэкстаў | | 2 | | | | |
| 2 | Тыпавыя сцэнарыі падарожжа | | 2 | | | | |
| 3 | Асэнсаванне паняццяў “трэвэл-журналістыка” і “трэвэл-блогінг” | | 2 | | | | |
| 4 | Тэлевізійная трэвэл-журналістыка | | 4 | | | | Тэст 1 |
| 5 | Тыпалогія журналісцкіх трэвэл-медыятэкстаў: інфармацыйна-пазнаваль-ныя, інфармацыйна-папулярызуючыя, ін-фармацыйна-рэкламныя ТМТ | | 10 | | | | Тэст 2 |
| 6 | Спосабы і прыёмы мовапараджэння. Рэалізацыя функцый асветы (інфармавання), пераканання (уздзеяння), выхавання і забаўляння | | 10 | | | | Тэст 3 |
| 7 | Міжкультурная камунікацыя. Этычныя і культурна-маўленчыя нормы ТМТ | | 4 | | | | Тэст 4 |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## І. ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*


1. Капцев, В.А. Трансформации жанра «путевой прозы» в современную эпоху / В.А. Капцев // Журналістыка-2013: стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы 15-й Міжнар. навук.-практ. канф., 5–6 сн. 2013 г., Мінск / рэдкал.: С.В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – Вып. 14. – С. 373–377.
2. Кара-Мурза, Е.С. Полиинтенциональность медиатекста (на материале путеводителя как досугового издания) / Е.С. Кара-Мурза // Медиатекст как полиинтенциональная система: сб. статей; отв. ред. Л.Р. Дускаева, Н.С. Цветова. – СПб., 2012. – С. 33–40.
3. Майданова, Л.М. Проблема достоверности информации в журналистских практиках: речевой аспект / Л.М. Майданова, Э.В. Чепкина // Этика речевого поведения российского журналиста; ред.-сост. Л.Р. Дускаева. – СПб., 2009. – С. 135–166.
4. Познин, В. Ф. От научно-познавательного к познавательно-развлекательному дискурсу / В.Ф. Познин // Средства массовой информации в современном мире. Петербургские чтения: Материалы 50-й международной научной конференции; отв. ред. С.Г. Корконосенко. – СПб., 2011. – С. 53–56.
5. Показаньева, И.В. Генезис отечественного научно-популярного телевидения географической тематики: возникновение телевизионной трэвел-журналистики / И.В. Показаньева // Вопросы теории и практики журналистики. – 2014. – № 5. – С. 74–82.
6. Показаньева, И.В. К теоретизации отношений автора и дестинации в трэвел-журналистике / И.В. Показаньева // Universum: Филология и искусствоведение: электрон. научн. журн. [Электронный ресурс]. – 2014. – № 8 (10). – Режим доступа: http://7universum.com/ru/philology/archive/item/1529. – Дата доступа: 23.08.2015.
7. Показаньева, И.В. Проблемное поле трэвел-журналистики как явления современного медиапространства / И.В. Показаньева // Медиаскоп: электронный научный журнал Факультета журналистики МГУ им. М.В. Ломоносова [Электронный ресурс]. – 2013. – Вып. № 3. – Режим доступа: http://www.mediascope.ru/node/1385. – Дата доступа: 23.08.2015.
8. Показаньева, И.В. Теоретическое осмысление основ трэвел-блогинга. Функциональные отличия трэвел-блогера и трэвел-журналиста / И.В. Показаньева // Universum: Филология и искусствоведение: электрон. научн. журн. [Электронный ресурс]. – 2015. – № 3-4 (17). – Режим доступа: http://7universum.com/ru/philology/archive/item/2083. – Дата доступа: 23.08.2015.
9. Редькина, Т.Ю. Рекламные интенции в трэвел-медиатексте / Т.Ю. Редькина // Медиатекст как полиинтенциональная система: сб. статей / под ред.

Л.Р. Дускаевой, Н.С. Цветовой. – СПб.: С.-Петерб. гос. ун-т, 2012. – С. 183–190.
10. Редькина, Т.Ю. Средства реализации развлекательной функции в трэвел-тексте / Т.Ю. Редькина // Вестник СПбГУ. Серия 9. – СПб., 2011. – Выпуск 4. – С. 210–218.
11. Редькина, Т.Ю. Трэвел-медиатекст: способы и приёмы речепорождения: учеб.-метод. пособие / Т.Ю. Редькина. – СПб.: С.-Петерб. гос. ун-т, Высш. шк. журн. и мас. коммуникаций, 2013. – 74 с.
12. Редькина, Т.Ю. Трэвел-текст: просвещение, убеждение или развлечение? / Т.Ю. Редькина // Средства массовой информации в современном мире. Петербургские чтения: материалы 50-й международной научной конференции. – СПб., 2011. – С. 56–58.
13. Редькина, Т.Ю. Этические и культурно-речевые нормы в трэвел-медиатексте / Т.Ю. Редькина // Экология языка и коммуникативная практика [Электронный ресурс]. – 2014. – № 1. – С. 150–160. – http://ecoling.sfu-kras.ru/wp-content/uploads/2014/04/Redkina-T.Y.pdf. – Дата доступа: 23.08.2015.
14. Редькина, Т.Ю. Этические нормы в трэвел-журналистике / Т.Ю. Редькина // Этика массовых коммуникаций: опыт и научные исследования в России и Германии: матер. Междунар. семинара 3-4 октября 2013 г. – СПб., 2013. – С. 75–77.
15. Садохин, А.П. Межкультурная коммуникация: уч. пособие / А.П. Садохин. – М., 2004. – 288 с.
16. Сизикова, Ю. Путевой очерк XXI века. Новые особенности старого жанра / Ю. Сизикова // Медиа. Демократия. Рынок. Часть 2. Функционирование средств массовой информации в сфере досуга: Материалы международной научной конференции; под ред. Л.Р. Дускаевой. – СПб., 2010. – С. 199–205.
17. Тангалычева, А.К. Этнокультурная коммуникация / А.К. Тангалычева // Основы теории коммуникации: учеб. пособие; отв. ред. Д.П. Гавра. – СПб., 2006. – Ч. 2. – С. 146–177.
18. Шачкова, В.А. «Путешествие» как жанр художественной литературы: вопросы теории / В.А. Шачкова // Филология. Искусствоведение. Вестник Нижегородского университета им. Н.И. Лобачевского. – 2008. – № 3. – С. 277–281.

*Дадатковая*

1. Арутюнова, Н.Д. Проблемы коммуникации / Н.Д. Арутюнова // Язык и мир человека. – М., 1999. – С. 643–686.
2. Бауман, З. От паломника к туристу / З. Бауман // Социологический журнал. – 1995. – № 4. – С. 133–154.
3. Вежбицкая, А. Понимание культур через посредство ключевых слов / А. Вежбицкая. – М., 2001. – 288 с.
4. Вежбицкая, А. Сопоставление культур через посредство лексики и прагматики / А. Вежбицкая. – М., 2001. – 272 с.
5. Гак, В.Г. Эмоции и оценки в структуре высказывания и текста / В.Г. Гак //

Языковые преобразования. – М., 1998. – С. 645–661.
6. Герд, А.С. Введение в этнолингвистику / А.С. Герд. – СПб., 2001. – 488 с.
7. Глазунова, И. Картина мира блоггера-путешественника / И. Глазунова // Опыты. Les Essais: альманах научных работ [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа: http://jf.spbu.ru/essais/2916-9021.html. – Дата доступа: 23.08.2015.
8. Дускаева, Л.Р. Диалогичность речи / Л.Р. Дускаева // Стилистический энциклопедический словарь русского языка; под ред. М.Н. Кожиной. – М., 2003. – С. 45–53.
9. Жолнерович, П.П. Диалогизация писательского публицистического дискурса / П.П. Жолнерович // Language and Culture: Scientific Peer Reviewed Journal (Kutaisi, Georgia). – 2011. – № 6. – С. 90–92.
10. Іўчанкаў, В.І. Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В.І. Іўчанкаў. – Мінск: БДУ, 2003. – 257 с.
11. Кайда, Л. Г. Позиция автора в публицистике. Стилистическая концепция / Л.Г. Кайда // Язык современной публицистики: сб. статей; сост. Г.Я. Солганик. – М., 2005. – С. 58–66.
12. Крюков, А.Н. Фоновые знания и языковая коммуникация / А.Н. Крюков // Этнопсихолингвистика. – М., 1988. – С. 19–34.
13. Марковина, И.Ю. Культура и её этнопсихолингвистическая ценность / И.Ю. Марковина, Ю.А. Сорокин // Этнопсихолингвистика. – М., 1988. – С. 5–19.
14. Маслова, Н.М. Путевой очерк: проблемы жанра / Н.М. Маслова. – М., 1980. – 116 с.
15. Николаева, Т.М. Текст как путь и как многомерное пространство / Т.М. Николаева // Концепт движения в языке и культуре. – М., 1996. – С. 336–352.
16. Нуртдинова, Ю.Ш. Трэвел-журналистика в системе современных СМИ: особенности и причины популярности / Ю.Ш. Нуртдинова // Медиасфера: проблемы и точки развития. Результаты квалификационных исследований, рекомендованных к публикации: сб. науч. работ бакалавров журналистики; ред. и сост. асп. А.Н. Марченко. – СПб., 2014. – Вып. 1 (7) – С.35–39.
17. Редькина, Т.Ю. Непрофессиональный трэвел-текст и территориальный имиджмейкинг / Т.Ю. Редькина // Медиалингвистика: сборник статей. – СПб., 2015. – Выпуск 4. – С. 136–139.
18. Редькина, Т.Ю. Речевая разработка темы «другая страна» / Т.Ю. Редькина // Русская речь в средствах массовой информации: речевые системы и речевые структуры; под ред. В.И. Конькова, А.Н. Потсар. – СПб., 2011. – С. 70–123.
19. Сепир, Э. Язык, раса и культура / Сепир Э. // Избранные труды по языкознанию и культурологии. – М., 1993. – С. 185–194.
20. Шостак, М.И. Жанры художественной публицистики. / М.И. Шостак. – М., 2000. – 187 с.

## ІІ. РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ

У працэсе вывучэння дысцыпліны студэнтам рэкамендуецца рэгулярна працаваць з тэкстамі і з пункту гледжання структуры і зместу выяўляць іх асноўныя характарыстыкі. За час вывучэння дысцыпліны студэнт павінен падрыхтаваць падборку рэдактарскіх недахопаў, выяўленых у ТМТ. Неабходнасць пастаянна ўдасканальваць сваю маўленчую кампетэнцыю для стварэння і якаснага рэдагавання ТМТ патрабуе ад будучага журналіста пастаянна сачыць за выхадам новай даведачнай літаратуры, найперш беларускіх і рускіх слоўнікаў розных тыпаў.

## ІІІ. РЭКАМЕНДУЕМЫЯ СРОДКІ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю якасці адукацыі выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- тыпавыя заданні;
- тэсты па асобных раздзелах і дысцыпліне ў цэлым;
- аналіз прапанаваных трэвэл-медыятэкстаў;
- напісанне ўласнага трэвэл-медыятэксту;
- вусны залік.

## IV. ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Паняцце “трэвэл-тэкст”. ТМТ у сістэме краіназнаўчых тэкстаў.
2. Падарожжа як сацыякультурнае дзеянне. Тыпавыя сцэнары падарожжа.
3. Функцыянальныя адрозненні трэвэл-блогера і трэвэл-журналіста.
4. Этапы станаўлення тэлевізійнай трэвэл-журналістыкі.
5. Тэндэнцыі і перспектывы сучаснай трэвэл-праграмы. Інфатэйнмент як асобая форма падачы матэрыялу.
6. Інфармацыйна-пазнавальны ТМТ.
7. Інфармацыйна-папулярызуючы ТМТ.
8. Інфармацыйна-рэкламны ТМТ.
9. Спосабы і прыёмы мовапараджэння. Жанрая палітра трэвэл-журналістыкі.
10. Рэалізацыя функцый асветы (інфармавання) у ТМТ.
11. Рэалізацыя функцый пераканання (уздзеяння) у ТМТ.
12. Рэалізацыя функцый выхавання ў ТМТ.
13. Рэалізацыя функцый забаўляння. Стварэнне эфекта займальнасці ў ТМТ.
14. Трэвэл-тэкст як элемент міжкультурнай камунікацыі.
15. Этычныя і культурна-маўленчыя нормы і гуманізуючыя камунікатыўныя стратэгіі ТМТ.

**ПРАТАКОЛ**
**УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

| **Назва вучэбнай дыцылiны, з якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола)** |
|---|---|---|---|
| Сучасная беларуская мова | Стылістыкі і літаратурнага рэдагавання | Прапаноў няма | Заўваг няма. Пр. № 10 ад 26.05.2015 |
| Мова і стыль сродкаў масавай інфармацыі | Стылістыкі і літаратурнага рэдагавання | Прапаноў няма | Заўваг няма. Пр. № 10 ад 26.05.2015 |
| Рэдагаванне | Стылістыкі і літаратурнага рэдагавання | Прапаноў няма | Заўваг няма. Пр. № 10 ад 26.05.2015 |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЯНЕННІ**
**ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**
**НА 20__ / 20__ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД**

| № п/п | Дапаўненні і змяненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры

Стылістыкі і літаратурнага рэдагавання (пратакол № __ ад __. __. 20__ г.)
*(назва кафедры)*

Загадчык кафедры

Д-р філал. навук, прафесар ______________________ В.І.Іўчанкаў
*(ступень, званне)* *(подпіс)* *(І.ІпБ.Прозвішча)*

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дэкан факультэта

Канд. філал. навук, дацэнт ______________________ С.В.Дубовік
*(ступень, званне)* *(подпіс)* *(І.ІпБ.Прозвішча)*